**Аляксандр Патапавіч Валынец (1935, Пінскі р-н), вучоны ў галіне фізіялогіі і біяхіміі раслін, лаўрэат прэміі акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы (1996), прэміі НАН Беларусі (2007)**



Беларускі вучоны ў галіне фізіялогіі і біяхіміі раслін. Доктар біялагічных навук (1974), прафесар (1997).

Нарадзіўся 2 лютага 1935 г. у в. Берказы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і пуцявога абходчыка. Дзяцінства прайшло ў гады нямецкай акупацыі і цяжкі пасляваенны час. У 1954 годзе пасля заканчэння Малоткавіцкай сярэдняй школы паступіў на хіміка-біялагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута, які закончыў на выдатна ў 1960 г. Будучы студэнтам двойчы удзельнічаў у асваенні цалінных зямель у Казахстане. Працаваў настаўнікам у Жытамлянскай сярэдняй школе Гродненскага раёна.

З 1961 г. займаўся ў аспірантуре пры Інстытуце біялогіі АН БССР (цяпер Інстытут эксперыментальнай батанікі імя В.Ф.Купрэвіча НАН Беларусі). Абараніў кандыдацкую, а затым і доктарскую дысертацыі, прысвечаныя даследаванню анатама-марфалагічным і фізіёлага-біяхімічных асаблівасцей выбіральнасці дзеяння гербіцыдаў.

З 1982 па 2006 гады - загадчык лабараторыі фізіялогіі патагенеза і хвораўстойлівасці раслін. У гэты перыяд лабараторыя пашырыла тэматыку даследаванняў у вобласці вывучэння накіраванай рэгуляцыі хваробаўстойлівасці раслін з дапамогай прыродных рэгулятараў росту.

А.П.Валынец – заснавальнік беларускай школы эндагенных рэгулятараў росту і развіцця раслін, фізіялогіі фітаімунітэта і абароны раслін. У 2007 г. узнагароджаны прэміяй НАН Беларусі за ўклад у разработку рэгулятарных асноў фітаімунітэта.

А.П.Валынец - аўтар навуковых прац па фізіялогіі дзеяння гербіцыдаў, рэгулятарных механізмаў патагенезу і фітаімунітэту. Выявіў здольнасць прыродных фенолаў рэгуляваць рост клетак расцягваннем. Распрацаваў метады аналізу фітагармонаў і фенольных злучэнняў, спосабы павелічэння ўстойлівасці і прадукцыйнасці раслін.

Аўтар больш 340 навуковых прац, 8 манаграфій і 8 патэнтаў на вынаходніцтва. Падрыхтаваў 8 кандыдатаў біялагічных навук.

Узнагароджаны медалём "За асваенне цалінных зямель" і Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1981). У 1996 г. за цыкл работ па фітаімунітэту злакаў узнагароджаны дыпломамі і прэміямі прэзідэнтаў НАН Украіны, НАН Малдовы, НАН Беларусі (і ў 2007).

У 2010 годзе знагароджаны нагрудным знакам "У гонар 80-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі".

Жыве ў Мінску.

## Працы А. П. Валынца

1. **Волынец, А. П.** Анатомо-морфологическая характеристика устойчивости сортов льна-долгунца к натриевым солям 2,4-Д и 2М-4Х : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата биологических наук / А. П. Волынец ; Академия наук БССР, Институт экспериментальной ботаники и микробиологии. Минск, 1964
2. **Волынец, А. П.** Действие гербицидов 2М-4Х и 2,4-Д на сорта льна-долгунца / А. П. Волынец, С. М. Маштаков. Минск,1965
3. **Маштаков, С. М.** Физиологическое действие гербицидов на сорта культурных растений / С. М. Маштаков, В. П. Деева, А. П. Волынец ; под ред. Ю. В. Ракитина ; Акад. наук Бел. ССР, Ин-т эксперим. ботаники. Минск, 1967
4. **Прохорчик, Р. А.** Физиологическое действие некоторых гербицидов на растения / Прохорчик, Р. А., Щербаков, В. А., Волынец, А. П., Деева, В. П., Кудрявцев, Г. П., Маштаков, С. М. ; под ред. Ю. В. Ракитина ; Академия наук БССР, Институт экспериментальной ботаники. Минск, 1971. 249 с. : ил., табл.
5. **Физиологическое** действие некоторых гербицидов на растения / С. М. Маштаков [и др.] ; под редакцией Ю. В. Ракитина ; Академия наук Белорусской ССР, Институт экспериментальной ботаники. Минск, 1971
6. **Волынец, А. П.** Взаимодействие эндогенных регуляторов роста и гербицидов : [монография] / А. П. Волынец ; Академия наук Белорусской ССР, Институт экспериментальной ботаники им. В. Ф. Купревича ; науч. ред. Ю. В. Ракитин. Минск, 1980. 143с. : ил., табл.
7. **Волынец, А.П.** Ароматические оксисоединения - продукты и регуляторы фотосинтеза : монография / А. П. Волынец, Р. А. Прохорчик ; науч. ред. В. М. Иванченко, д-р биол. наук ; Академия наук БССР, Институт экспериментальной ботаники им. В. Ф. Купревича. Минск, 1983. 155 с. : ил.
8. **Касач, А.М.** Интродукция дикорастущих видов люцерны в Белоруссии / А. М. Касач ; АН БССР, Центр. ботан. Сад ; науч. ред. А. П. Волынец. Минск, 1988
9. **Избирательное** действие химических регуляторов роста на растения : физиол. основы / В. П. Деева, З. И. Шелег, Н. В. Санько ; науч. ред. А. П. Волынец ; АН БССР, Ин-т эксперим. ботаники им. В. Ф. Купревича. Минск, 1988
10. **Проблемы** иммунитета сельскохозяйственных растений к болезням : монография / Н. А. Дорожкин, С. И. Бельская, Е. А. Волуевич, А. П. Волынец [и др.] ; Академия наук БССР, Институт экспериментальной ботаники им. В. Ф. Купревича. Минск, 1988. 248 с.

11. **Физиология** плодообразования люцерны / А. П. Волынец и др. ; Академия наук Белорусской ССР, Институт экспериментальной ботаники им. В. Ф. Купревича. Минск, 1989
12. **Гончарик Н. Н.,** Волынец А. П., Кинтя П. К. Действие и последействие стероидных гликозидов при инфицировании растений пшеницы / Н. Н. Гончарик, А. П. Волынец, П. К. Кинтя // Весці Нац. АН Беларусі. Сер. біял. навук. 2005. № 1
13. **Шуканов, В. П.** Гормональная активность стероидных гликозидов растений / В. П. Шуканов, А. П. Волынец, С. Н. Полянская ; Национальная академия наук Беларуси, Институт экспериментальной ботаники им. В. Ф. Купревича. Минск, 2012
14. **Волынец, А.П.** Фенольные соединения в жизнедеятельности растений / А. П. Волынец ; науч. ред. В. Н. Решетников ; Национальная академия наук Беларуси, Институт экспериментальной ботаники им. В. Ф. Купревича. Минск, 2013.
15. **Стероидные гликозиды** – новые фиторегуляторы гормонального типа / А. П. Волынец, В. П. Шуканов, С. Н. Полянская. Минск : Право и экономика, 2003. 134 с.

## Аб жыцці і дзейнасці А.П.Валынца

1. **Валынец** Аляксандр Патапавіч // Энцыклапедыя прыроды Беларусі : у 5 т. / рэдкал. : І.П.Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск,1983. Т.1. С.408
2. **Валынец** Аляксандр Патапавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал. : Г.П.Пашкоў [і інш.]. Мінск,1996. Т. 2. С.488
3. **Валынец** Аляксандр Патапавіч // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. Мінск, 2003. С. 483
4. **Волынец** Александр Потапович // Учёные Пинщины / авт.-сост. И. А. Кибак, П. Н. Синкевич. Минск, 2003. С. 32–33
5. **Волынец** Александр Потапович // Учёные Пинщины / авт.-сост. И. А. Кибак, П. Н. Синкевич, В. В. Василевицкий. Пинск, 2012. С. 30
6. **Серова, З. Я.** Профессор с Пинщины : 2 февраля исполняется 75 лет доктору биологических наук профессору Александру Потаповичу Волынцу / З. Я. Серова, Л. А. Пшеничная, В. П. Шуканов // Полесская правда. 2010. 30 января
7. **Энцыклапедыя прыроды** Беларусі. У 5-і т. Т. 1. Ааліты — Гасцінец / Рэдкал. І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. — Мн. : БелСЭ ім. Петруся Броўкі, 1983. — 575 с., іл. — 10 000 экз. — С. 408.
8. **Беларуская энцыклапедыя** : У 18 т. Т. 3 : Беларусы — Варанец / Рэдкал. : Г. П. Пашкоў і інш. — Мн. : БелЭн, 1996. — 511 с. : іл. .
9. **ВолынецАлександр Потапович** // Режим доступа: http://www.bla.by /new/item/303-база-данных-ученые-беларуси.html.